Oplata pocztowa piszczona ryczałtem.

№ 3 (111) Аўторак 31-га студзеня 1928 г. м. Вільня. Год III.

Беларускае слова

Выходзіць раз у тыдзень

Цана нумару 20 грош.

Нацыянальнае адраджэньне.— [illegible] -нацыянальная аутаномія.—Зямля сялянам на падставе уласнасьці.—Шырокі дэмократызм.—Барацьба з [illegible] царква.—Краевая згода.—Далучэньне Усходняй Беларусі да Заходняй.

Падпісная цана на 1 месяц 1 зл. [illegible]
" " " 3 " 2 зл.
Заграніцу ўдвая даражэй.

Адрэс Рэдакцыі і Адміністр. Wilno ul. Zawalna 6 m. 4, тэл. 14-35.
Рэдакцыя адчынена ад 12—2 гадз. штодня апрача сьвятаў.

Цана абвестак: На 1 старане —20 гр.
" У тэксце . —40 гр.
" На 4 старане —15 гр.
За кожны мілім. шырыны ў 1 шпальту.
Старана мае 8 шпальтаў.

Перасьцярога.

Паўтары гады назад Беларуская Нацыянальная Рада праз свае адозвы **два разы** папераджала грамадзян аб той небясьпецы, якая пагражала Беларускаму Народу, а перад усім беларускаму сялянству з боку рожных пралетарска-камуністычных арганізацыяў, як Грамада, Н. П. Х. і іншыя. І папераджала, што тых, хто паверыць ашуканчым словам гэтых партыяў, хто войдзе ў іх, трапіць вялікае няшчасьце, як арышты, турма, разарэньне гаспадаркі і г. д.

Многія з беларусаў нас не паслухалі, але **было шмат гэткіх, якія нас паслухалі** і ці зусім не пайшлі у гэтыя арганізацыі, ці выпісаліся ў час з іх, сотнямі складаючы аб гэтым заявы да нашай газэты.

Аднак-жа вялікая большасьць была атручана салодкімі абяцанкамі і ў хуткім часе наступіла разьвязка: Грамада была аб'яўлена нелегальнай, сотні грамадаўцаў разам з пасламі трапілі да турмаў, тысячы запісаны на чорную дошку і ня жывуць, а мучаюцца то мэльдуючыся на пастарунках, то знаходзячыся пад сталым даглядам паліцыі, як над антыдзяржаўным элемэнтам!...

Народ пракляў Грамаду, зразумеў, што быў на мыльнай дарозе і пасьля пэўных хістаньняў пачаў выхадзіць на роўны, правідловы шлях. На мейсцы Грамады пачалі надзвычай хутка расьці і разьвівацца беларускія ўмяркаваныя, нацыянальныя арганізацыі.

Гэтак магутна разраслася і расьце далей „Прасьвета", налічваючы 126 аддзелаў, пашырылася, ахапіўшы некалькі тысячаў сяброў, Бел. Нац. Партыя. Паўстаў першы Беларускі Камітэт па справам Самаўрадаў, налічваючы ўжо больш 200 сяброў, радных. Гэтая новая **Нацыянальная Сіла**, паўстаўшая на мейсцы згінуўшай Грамады, пачала не на жарты непакоіць нашага ўсходняга суседа — менскіх камуністаў. Даволі прачытаць толькі менскія бальшавіцкія газэты, а асабліва „Савецкую Беларусь", каб праканацца, як ненавідзяць нашыя арганізацыі камуністы! Ненавідзяць і баяцца...

Але зрабіць нам яны нічога не маглі. Народ ужо ня хоча слухаць пустых абяцанак, народ змучаны непатрэбнымі арыштамі, вобыскамі, турмамі. Ён хоча не рэвалюцыі, а зямельнай рэформы, роднай школы, палягчэньня падатковага цяжару і г. д.

Дык тая роўная, паступовая, **рэальная і законная дарога**, на якую клікалі нашыя нацыянальна-умяркаваныя арганізацыі, была найбольш адпавядаючай імкненьням Народу.

Але вось падыйшлі выбары. Пачалася перадвыбарная гарачыня. Даведаўшыся аб тым, што ўсе нацыянальныя арганізацыі ў лучнасьці і еднасьці з шырокімі масамі **Народу** праз ягоных выбраных прадстаўнікоў **ідуць на выбары сьмела, адзіным нацыянальным сьпіскам** — камуністыя зразумелі, што **нашая перамога на выбарах**, — гэта сьмерць для пралетарска-камуністычных арганізацыяў. З гэтае прычыны яны пачалі ўжываць самых крайніх сродкаў, каб перапікодзіць на выбарах гэтаму Адзінаму Беларускаму Нацыянальнаму Сьпіску. Тутака камуністыя кінуліся да свайго старага выпрабаванага сродку: **правакацыі і подкупу.**

Мы маем пэўныя даныя, што менскімі камуністамі кінуты вялікія грошы на выбарную акцыю, а перад **усім на перакуп** сяброў іншых арганізацыяў, а ў першую чаргу нашых.

Да гэтага часу **за тры гады у нас ня было выпадкаў** пераходу нашых сяброў да іншых арганізацыяў. Наадварот — грамадаўцы, пэпэсы, вызваленцы і сельсаюзьнікі масамі пераходзілі да нас. А тут сталі здарацца выпадкі выхаду з нашых арганізацыяў. Праўда выступілі адзінкі, але выступілі. Прычына тут адна — **перакуп.** Заплацілі Пятровічу, як кажуць, ажно 400 даляраў. Іншым плацяць менш. Гэтак аднаму з нашых інструктараў, Сьветавастокаву заплацілі толькі 100 злотых, праканалі яго, што мы „развальваемся" і ён, седзячы на далёкай вёсцы, паверыў, падаў заяву аб выхадзе з нашай арганізацыі, а потым прыслаў пісьмо, дзе каецца, што **яго падкупілі** і просіць выбачыць яго.

Шчасьлівы Сьветавастокаў, што ў пару адумаўся і адрокся як бальшавіцкіх грошаў, так і тых абавязкаў, якія **мусіў бы** выканаць за гэтыя грошы.

Дык вось Грамадзяне! Мы у гэтую гарачую пару зноў **падымаем свой голас перасьцярогі!** Ня кідайцеся на лёгкія грошы. Памятайце, што **нічога няма тайнага, што ня стала бы яўным.** Памятайце, што тыя, каго бальшавікі купяць за даляры, **зробяцца іх рабамі**, бальшавікі уцягнуць іх у далейшую згубную працу, якая раней ці пазьней **прывядзе да турмы.**

Грамадзяне! Прыпомніце на хвілінку лёс тых грамадаўцаў, якія пакутуюць да сяньняшняга дня ў турме! Не давайце новых ахвяраў праклятым камуністам, як адкрытым, так і скрытым!

Замест зьліквідаванай „Работніцка-Сялянскай Грамады" паўстала ажно два чортавых дзецішчы яе, якія **скрываюць свой праўдзівы твар, гэта „Беларускае Работніцкае-Сялянскае Аб'яднаньне"** на чале з нейкімі Юхно і Бэрнтам і „Цэнтральны Камітэт Беларускага Сялянства і Работніцтва", у які увайшлі адкрытыя ці скрытыя грамадаўцы.

Аб гэтых арганізацыях, а асабліва аб рожных тайных агэнтах іх мы і перасьцярагаем Вас, Грамадзяне!

Даволі было сьлёз, гора, працэсаў і турмаў! Беларускі Народ павінен напружыць усе сілы, каб выбраць праўдзівае народнае беларускае прадстаўніцтва, якое будзе дбаць аб рэальных патрэбах Народу, а не рабіць рэвалюцыі.

Дык, Грамадзяне! Ганіце вон гэтых тайных агітатараў! Асьцярагайцеся браць ад іх хаця адзін грош, бо за яго Вас могуць трапіць вялікія беды.

Аб гэтым Вас упраджаюць **тыя** беларускія нацыянальныя арганізацыі, якія злучыліся ў Агульна-Беларускі Народны Выбарны Камітэт і якія ўжо ня раз упраджалі Вас і ратавалі ў бядзе.

Ня слухайце салодкіх абяцанак і гучных лёзунгаў тых, якія кажуць памі-ж сябе, што ідуць шляхам: **„чым горш Народу, тым ляпей ім"**, бо будзе хутчэй рэвалюцыя. Яны вас цяпер, як і ўвесь час, ізноў стараюцца ашукаць і падвясьці, гаворачы, **што баяцца няма чаго, бо-ж выбары будуць тайныя.**

Так, тайныя; хто іменна і за каго кінуў голас, нельга будзе даведацца. Але гэта яшчэ гарэй. **Бо адказваць будуць ужо не адзінкі, якія ідуць за камунізуючымі сьпіскамі, а цэльныя абводы, з якіх падуць галасы на гэныя сьпіскі**

У гэтых абводах будуць шукаць, трасьці і гэткім чынам цэлыя абводы будуць цярпець за мо' некалькіх неасьцярожных, абдураных сваіх грамадзянаў.

Дык браты Беларусы! ганіце прэч усіх, хто вядзе вас на згубны шлях камуны!

Кожны, хто кіне голас за сьпіскі вылюжэйпамяненых „Камітэтаў", здрадзіць увесь свой абвод, падвядзе ўсіх суседзяў!

Адзіны шлях, які не пагражаючы нічым, дасьць нам сапраўды шчырых абаронцаў, сапраўды беларускіх пасолў — **гэта шлях нашага, Агульна-Бел. Выб. К-ту!**

Дык усе як адзін галасуйце за сьпісак гэтага Камітэту!

ЦЭНТРАЛЬНЫ АГУЛЬНА-БЕЛАРУСКІ НАРОДНЫ ВЫБАРНЫ К-Т.

Палітычны агляд.

Кінуўшы першы ўзрок на Усход, у страну чырвонага тэрору, мы ўбачым, што **самаліквідацыя бальшавіцкай дыктатуры ідзе гіганцкімі крокамі.**

Адменнаю рысаю бальшавіцкай дыктатуры да гэтай пары было тое, што ўсе непаразуменьні сярод сябраў камуністычнай кіруючай клікі ня выходзілі за межы гэтае касты. Сьмяцьцё ня выносілася з хаты. Грызьліся, дыскутавалі, спрачаліся між сабою, але гэта не пагражала адзінству і цэльнасьці касты, спаянай супольнымі праступленьнямі і страхам перад будучым страшным народным судом. Самае горшае, што пагражала непакорным апазыцыянэрам, гэта тое, што іх вызначалі на іншае становішча ці высылалі на хвілёвы прымусовы адпачынак на адзін з лепшых крымскіх ці каўкаскіх курортаў, як гэта было з Троцкім.

Гэта сыстэма практыкавалася пры старым царскім рэжыме ў жандармэрыі, меўшай каставыя службовыя тайны. Якое бы праступленьне па службе ня было учынена, віноўнаму пагражала толькі тое, што яго замест звальненьня са службы, заслужанай турмы ці катаргі высылалі на другі службовы аклад дзе небудзь на акраіну. Але сьвет ня бачыў яшчэ такога стараннага захаваньня партыйнае тайны, якое да гэтай пары практыкавалася ў камуністычнай партыі, ня гледзячы на тое, што яна абхапляе ўвесь сьвет. Што толькі не тварылася ў чырвоным Крамлі, у падвалах чрэзвычайкі, аставалася пакрытым непранікнавеннаю тайнаю. І гэта засада „нявынясеньня сьмяцьця з хаты", безадказнасьці і непагрешымасьці за свае чыны галоўных лідэраў партыі, стаяўшых нясьменна ў працягу 10 гадоў на чале партыі і дзяржаўнае ўлады, толькі дадала сьмеласьці апазыцыі ў яе партыйнай барацьбе. Ворагі бальшавікоў ужо пачыналі траціць цярпеньне ў чаканьні, калі-ж нарэшце пачнецца гэты „тэрмідор" расейскае рэвалюцыі.

Але ўсяму бывае свой канец і як бальшавікі не стараліся унікнуць гістарычнае судзьбы францускай камуны, ім гэтага ня ўдалася. І ня гледзячы на самазабойчыя скуткі партыйнага развалу, бальшавікі на вачох усяго буржуазнага сьвету, на вачох прытуліўшыхся бязьлікіх сваіх унутраных ворагаў распачалі не на жыцьцё, а на сьмерць узаемную барацьбу.

Ці мог хто чакаць, што на дзесяты год істнаваньня камуністычнае чырвонае ўлады будуць высылацца ў ссылку да Сыбіры, Туркестану і Поўначы Расеі галоўныя кіты бальшавізму? Варта толькі бліжэй прыглядзецца на фармуляр тых асобаў, якія папалі ў першую пачку высланых на некалькі гадоў ў ссылку ў рожныя аддалёнyя і бязлюдныя мейсцы, каб пераканацца ў тым, што гэта ня жарты, што

распачалася апошняя рашучая барацьба за захаваньне улады.

1. Леў Троцкі, высланы ў Верны на граніцы Кітая. Спачатку правая рука Леніна, а затым прэтэндэнт на звольніўшыўся пасьля яго сьмерці крамлёўскі трон. Хто ня ведае бліскучае кар'еры Троцкага, якому найбольш забавязана бальшавіцкая рэвалюцыя сваёю перамогаю і дагэтуляшнім істнаваньнем.

2. Грышка Зіноўеў, краважадны выхаляны жыдок, дыктатар чырвонага Петраграду, упіваўшыйся распустаю ў бышым Царскім Зімнім дварцы. Кіраўнік камінтэрну. Быўшы ад'ютант Леніна і адзін з трох у палітбюро пасьля яго сьмерці. Сасланы дзесь на правінцыю у Эўропэйскай Расеі толькі дзеля таго, што раскаяўся і ў страху адрокся ад Троцкага.

3. Яго бліжэйшы таварыш Каменяў, дыктатар Масквы, адзін з „трох" у ўсеўладным палітбюро. Гэтак сама за раскаяньне сасланы у правінцыяльнае места унутры Эўропэйскае Расеі.

4. Белабародаў, быўшы камісар унутраных справаў, арганізатар морду царскае сям'і у Екатэрынбурзе.

5. Ракоўскі — быўшы дыктатар Украіны, а затым савецкі пасол у Лёндане і Парыжу.

6. Радэк—быўшы доўгі час рэдактарам петраградзкіх „Ізвесьцяў", а затым начальнікам усходняга аддзелу камісарыяту заграінічных справаў.

Даволі гэтага кароткага агляду галярэі гвалтоўна сайшоўшай са сцэны быўшай галоўкі камуністычнае партыі, каб забачыць, што тое, чаго з нецярплівасьцю чакаў увесь сьвет і асабліва змучаны расейскі народ, ужо распачалося і ідзе гэтак хутка, што трудна нават уцяміць сабе ўсё значэньне разыгрываючыхся ў Расеі падзеяў. Пасьля гэтага няма нічога дзіўнага, што раптоўна зьмяніўся настрой у адносінах бальшавікоў за граніцаю, якая паволі пачынае глядзець на бальшавікоў і бальшавізм наагул здаровымі вачыма. Бэльгійская патрыятычна настроеная студэнцкая моладзь разграміла савецкую выстаўку ў Брусэлі. Большасьць бэльгійскае прэсы ухваліла гэты ўчынак, ня гледзячы на тое, якія гэта можа мець палітычныя скуткі. Грэцкі Урад ухваліў пазбавіць сябраў савецкага гандлёвага прадстаўніцтва правоў нятыкальнасьці, прыслугуючых толькі дыплёматычным місыям. Малыя Бэльгія і Грэцыя загаварылі з бальшавікамі мовою запраўдных паноў у сябе дома і могуць паслужыць добрым прыкладам для большых дзяржаваў. Францускі ўрад ухваліў арыштаваць быўшых камуністычных паслоў палаты дэпутатаў, якія дзесь схаваліся. Хто хоць крыху знаёмы з францускаю палітычнаю свабодаю і толеранцыяй, для таго будзе прыметна наступіўшая перамена ў францускіх настроях у адносінах бальшавізму. Нават у маленькай Латвіі заметна перамена ў палітыцы ў адносінах свайго усходняга суседа. Папярэдні сацыялістычны ўрад, падпісаўшы з бальшавікамі гандлёвы дагавор і праэкт гарантыйнага пакту, скінуты, а на яго мейсца створаны цэнтра-правы. Латвія пашла па сьлядам Літвы. Дзеля гэтага няма нічога дзіўнага, што радавы ўрад, зьмяніў сваю пазыцыю ў адносінах Польшчы, ня гледзячы на прадстаячы працэс грамадаўцаў, лёсам якіх Масква і Менск вельмі зацікаўлены. Бальшавікі запрапанавалі Польшчы распачаць гандлёвыя перагаворы і ужо нават выехала польская дэлегацыя для перагавораў. Гэта бязсумліўны вынік пасьпеху польскае палітыкі на міжнарадовым тэрэні з аднаго боку і поўнага паражэньня савецкае палітыкі на усіх фронтах — з другога. Масквою нават робяцца крокі ў напрамку прымірэньня з Румыніяй, ня гледзячы на бесарабскі конфлікт. Гэта ужо поўная капітуляцыя бальшавікоў, шукаючых ратунку ў прымірэньні з сваімі бліжэйшымі суседзямі.

N.

Няудалая правакацыя Янкі Станкевіча.

Бязупынны лічбовы узрост і павялічэньне маральнага аўтарытэту нашых арганізацыяў сярод беларускага грамадзянства вельмі занепокоілі нашых палітычных ворагаў, якім гэтыя арганізацыі паважна перашкаджаюць у іх здрадніцкай працы. Распачаліся як зправа, так і злева шалёныя атакі ў прэсе, подкуп і пераманіваньні паасобных сябраў нашых арганізацыяў, правакацыя, інсінуацыя і іншыя подласьці, каб толькі хоць чым небудзь падарваць іх маральны аўтарытэт. Пасьля удаўшагася подкупа і здрады М. Пятровіча бальшавіцкая рэптылія грамагласна абвясьціла аб „развале Паўлюкевічаўшчыны". Затым тут-жа пусьціла правакацыйную вестку, падхопленую яе падгалоскамі, аб **раптоўным арышце М. Пятровіча**, зразумела адказнасьць за гэта зваліўшы на Паўлюкевіча, хаця усім добра ведама (аграмадаўцам ляпей, чым каму небудзь), што М. Пятровіч да гэтай пары не арыштаваны і ня скінуты з пасады войта Палачанскае гміны.

І калі зрабілі трывогу наваг грамадаўцы кінуўшыя вялікія грошы на „развал Паўлюкевічаўшчыны", дык што-ж гаварыць аб якімсь там Я. Станкевічу, які, ня маючы абсалютна ніякай арганізацыі, усё-ж такі хоча выпаўзьці на сьвятло. А тым балей, што скуль-та атрымаў грошы (але адкуль?...) хаця ня мае „шулерні". І па чуткам не малыя.

І вось, куды конь з капытам, туды і рак з кляшнею. „Калі Грамада перакупіла М. Пятровіча, — рашыў Я. Станкевіч, — дык чаму-ж я, „Спадар", не магу падкупіць каго-небудзь з Паўлюкевічаўцаў, калі на гэта маю грошы? Чаму-ж я не магу абвясьціць аб „новым развале Паўлюкевічаўшчыны... у сваім „Народзе?" Так было сказана і зроблена. Я. Станкевіч заманіў да сябе аднаго з сяброў нашых арганізацыяў К. Сьветавастокава, напаіў яго (глядзіце ніжэй паданыя дакумэнты і карэспандэнцыю К. Сьветавастокава у канцы нумару), „пад хмельком" выманіў ад яго заяву для сваей газэты аб выхадзе з нашых арганізацыяў, сунуў яму ў руку 100 зл. на першыя выдаткі, зьвярнуў кошт падарожы, абяцаў сэнацкі мандат, паўтарыў у сваім „Народзе" за „Думкаю Працы", як папугай, аб „новым развале Паўлюкевічаўшчыны" і думаў, што далей усё пойдзе, як па маслу...

Але кій аказаўся а двух канцох. Хацеў падкупленым К. Сьветавастокавым ударыць па арганізацыям А. Паўлюкевіча, а ў рэзультаце хапіў, як даўбешкаю, па сваей бітай фізьі.

Бо К. Сьветавастокаў, вярнуўшыся да дому і працьвярозіўшыся, апамятаўся, што зрабіў глупства на старасьці і пакаяўся перад А. Паўлюкевічам, вывяўшы на чыстую ваду Я. Станкевіча і яго няўдалую правакацыю. А замест „развала Паўлюкевічаўшчыны" Я. Станкевіч сам сеў у лужу.

Так-та, пане „Спадар"! Не заўсёды і не ўсякая правакацыя ўдаецца і праходзіць бязкарна для самых правакатараў!

Мы, зразумела, ня будзем пасьля гэткага скандальнага правалу правакацыі Я. Станкевіча крычэць аб развале Станкевічаўшчыны, бо там нічога ня было, німа і нечаму разваліваць, калі першага купленага пад пьяную руку за 100 зл. ён саваў у кандыдацкі сьпісак да Сэнату. Мы толькі хацелі паказаць беларускаму грамадзянству, з якімі нягоднымі і ганебнымі сродкамі боруцца з намі нашыя палітычныя ворагі, каб толькі хоць чым небудзь падарваць нашую пазыцыю.

Але ўсё гэта дарма...

(Ніжэй мы зьмяшчаем дакуманты К. Сьветавастокава, прысланыя ў Рэдакцыю)

Ад Цэнтральнага Агульна-Беларускага Народнага Выбарнага Камітэту.

ВІЛЬНЯ, ЗАВАЛЬНАЯ 6 — 4, ТЭЛ. 14 — 36.

Гэтым даводзіцца да ведама, што зарганізаваны наступныя Павятовыя Камітэты:

У Лідзкім Вокрузе:

1. У Маладэчне — вул. Пілсудзкага 1.
2. — Вялейцы — Маладэчанская 17.
3. — в. Гінеўцы, Куцэвіцкай гм., Ашмянскага пав. (А. Русецкі. Часова).
4. — Юрацішках — Валожынскага пав. на станцыі (Сапрон Гурын).
5. — Астрыні — Лідзкага пав.

Наваградзкім Вокрузе:

6. — Баранавічах — Сасновая 20.
7. — Слоніме — Гандлёвы Пляц.
8. — Дзятлаве — Наваградзкага пав. гатэль „Метрополь" 1.
9. — Клецку — Нясьвізкага пав, гат. Гэлера.
10. — в. Турэц, Стаупецкага пав. (Міх. Кур'янка).

Пісьмо К. Сьветавастокава.

У Рэдакцыю газэты „Беларускае Слова"

Прачытаўшы ў газ. „Думка Працы" дэкларацыю Пятровіча аб выхадзе з Нацыянальнае Партыі і аб тым бруду, які ён нанёс нашаму паважанаму павадыру п. Паўлюкевічу, я было ўсумніўся ў справядлівасьці апісанага, але калі потым пачалі хадзіць чуткі аб тым, што быццам Нацыянальная Партыя разсыпаецца, я захістаўся і быў сам ня свой. Што тут рабіць? Як раз атрымаў дэпэшу ад незнаёмага мне пана Станкевіча, якую да гэтага далучаю, і паехаў.

Там я зноў пачуў, быццам Нацыянальная Партыя запраўды разсыпаецца, а затым мне была зроблена прапазыка, каб я згадзіўся выставіць сваю кандыдатуру ў Сэнат. Я лічыў усё гэта за шчырасьць. Але-ж раздумаўся, што цяперака ўсе заняты лоўляю мандатаў, ідуць на рожныя ашуканствы; што камуністы ў сваю чаргу працуюць як мага, лезуць ува ўсе партыі, думаючы адно, а робячы другое, што тыя-ж камуністы быццам падкупілі і Пятровіча за 400 даляраў, — я прыйшоў да перакананьня, што паў ахвяраю цёмных людзей, дзеля чаго зрываю адносіны з Беларускім Сялянска-Работніцкім Камітэтам і, далучыўшы да гэтага пасьведчаньне за N 14, шчыра прашу Нацыянальную Раду выбачыць за мае карэспандэнцыі, якія я напісаў у газ. „Народ" і прыняць мяне ізноў у сваю Раду. Цяпер толькі я даведаўся, што ворагі паважанага п. Паўлюкевіча, займаючыся лоўляю мандатаў, дурачаць толькі нас, цёмных людзей, баламуцяць ды рожнымі подкупамі заманіваюць да сябе.

Бяру свае словы назад і зноў прашу ветліва Нацыянальную Раду прыняць мяне ў свае лона, куды заклікаю і ўсіх, папярэджываючы, каб ніхто ня слухаў рожных прайдзісьветаў.

Грошы 100 злотых, якія п. Станкевіч мне ўсунуў быццам на арганізацыйныя выдаткі, я лічу за п о д к у п і дзеля гэтага ў хуткім часе абяцаю ўнясьці іх праз Рэдакцыю газ. Беларускае Слова" на Чырвоны Крыж.

З шчырай пашанаю

К. Сьветавастокаў.

20 студзеня 1928 г.

ТЭЛЕГРАМА.

Сьветавастокаву Канстантыну. Прынята 12-1-1928 г.

„Прыяжджайце той час. Вільня Тургельская 22. Кошт наш. Станкевіч.

ГАЛОУНЫ ВЫБАРНЫ К-т
БЕЛАРУСКАГА
Сялянства і Работніцтва
14 студзеня 1928 г.
№ 14.
ВІЛЬНЯ, Тургельская 22.

ПАСЬВЕДЧАНЬНЕ.

Пакажчык гэтага грамадзянін Сьветавастокаў Канстанцін упаўнамачуецца Галоўным Выбарным Комітэтам Беларускага Сялянства й Работніцтва арганізоваваць на правінцыі выбарныя комітэты, склікаць зборкі і іншае.

Д-р Я. Станкевіч.
Старшыня.

М. П.

За Сэкратара
(прозьвішча не разборчывае).

Перад выбарамі да Сойму і Сэнату.

Дзяржауныя сьпіскі да Сойму і Сэнату.

Галоўнаю Выбарнаю камісіяй зарэгістраваны наступныя дзяржаўныя сьпіскі да Сойму і Сэнату:

№ 1 Безпартыйны блёк супрацоўніцтва з урадам.
№ 2 Польская партыя сацыялістаў.
№ 3 Вызваленьне.
№ 4 Бунд.
№ 5 Поалей-Ціон.
№ 6 Украінскі нац. саюз.
№ 7 N. P. R.
№ 8 Украінскі работніцка-сялянскі саюз.
№ 9 Няма.
№ 10 Сялянская партыя.
№ 11 Манархісты.
№ 12 — Радыкальная партыя сялянская кс. Оконя.
№ 13 Камуністычнай партыі, выступаючай под назваю „работніцка-сялянскае аб'яднаньне".
№ 14 Усходня-галіцыйскага с а ю з у супрацоўніцтва з Урадам з Стапіньскім і Сьлівіньскім на чале.
№ 15 Усходня-галіцыйскай каталіцка-нарадовай партыі кс. Чуя.
№ 16 Лявіца P.P.S. Андрэя Чумы.

Гэткім чынам блёк нац. меншасьцяў не атрымаў „16", чаго вельмі дабіваўся. А здарылася гэта так, што калі паўнамоцнік блёку пры галоўнай камісіі выйшаў на сьняданьне, у гэты час былі раздадзены 4 нумары, у тым ліку і 16. Дэлегат Грынбаўма хацеў, як кажуць, закончыць самагубствам ад роспачы.

№ 17 Жыдоўскае аб'яднаньне Усх. Галіцыі.
№ 18 Блёк нац. меншасьцяў
№ 19 Украінскае аб'яднаньне з Міх. Дурдэлло на чале.
№ 20 Расейскае народнае аб'яднаньне.
№ 21 Нац.-Дзяржаўны блёк працы з быўшым паслом Ванкевічам на чале.
№ 22 Выбарны блёк украінскіх сялянскіх сацыялістаў.
№ 23 „Związek Siły Chłopskiej" з Галавачом, Фідаркевічам, Ваявудзкім і Балінным на чале. Гэта быўшая N. P. Chł.
№ 24 Нацыянальна каталіцкага блёку.
№ 25 Польскі каталіцкі блёк (Пяст і Ch.D.)
№ 26 Украінская партыя працы.
№ 27 Поалей-Сыён.
№ 28 Украінскі блёк сялян, работнікаў і працоўнае інтэлігэнцыі.
№ 29 Выбарны камітэт інвалідаў і дэмабілізаваных ваенных.
№ 30 Каталіцкая вунія заходніх зямель.
№ 31 Сац. дэмакратычны блёк працы.
№ 32 Левае аб'яднаньне польскае самапомацы.
№ 33 Агульна-жыдоўскі нацыянальны блёк.
№ 34 Незалежная сацыялістычная партыя працы.
№ 35 — Пазнанскага клюбу працы.

КРЫЗЫС БЛЕКУ НАЦ. МЕНШАСЬЦЯУ.

Блёк нац. меншасьцяў перажывае нескапчальны крызыс. Прадстаўнік жыдоўскіх купцоў Трускер катэгарычна ня хоча фігураваць на сьпіску блёку меншасьцяў. Ня даў сваей згоды на гэта і віленскі радны інж. Спіра. Але найгорш тое, што дэмакраты групы Шабада маюць замяр зусім выйці з блёку. Каб направіць сытуацыю, выехалі для перагавораў да Варшавы б. сэнатар Рубінштэйн і радны віленскага магістрату Крук.

ЖЫДОУСКА-НЯМЕЦКІЯ ДАЛЯРЫ ДЛЯ БЛЕКУ НАЦ. МЕНШАСЬЦЯУ.

Орган жыдоўскага „Бунду" — „Найе Фолькcцайтунг" ад 18 студзеня падае з добра паінфармаваных і блізкіх да блёку нац. меншасьцяў колаў, што гэты блёк атрымаў на выбарную акцыю 50,000 даляраў. Палову гэтай сумы далі жыдоўскія прамыслоўцы і нямецкія абшарнікі, сыёністыя далі 15,000 даляраў і украінскае Ундо 6,000, а рэшту унясьлі астальныя групы, уваходзячыя у склад блёку. Але Ундо да гэтай пары быццам яшчэ не ўнясло указанай лічбы. Чаму не агітаваць цяпер Ярэмічу і Рагулі за жыдоўска-нямецкія даляры?

Цяпер яны купаюцца, як сыр у масьле. Пакуль пападуць да Сойму, так яшчэ можна дакупіць зямелькі і зрабіць прыстроячку к дамку. А Вы, беларускія сяляне, як хадзілі ў лапцях, так і будзеце хадзіць, бо не надзейцеся на абарону сваіх правоў у Сойме і Сэнаце ад паслоў, якія пройдуць за жыдоўска-нямецкія даляры!

НАРЭШЦЕ ЯРЭМІЧ „УЦІСНУУСЯ".

Дзяржаўны соймавы сьпісак блёку нац. меншасьцяў мае 32 прозьвішчы. На першым мейсцу фігуруе д-р Лявіцкі (украінец), затым ідуць па чарзе: Грынбаўм (жыд—сыёніста), Ярэміч (беларус), Науман, (немец), Хруцкі (украінец), Васільчук (украінец), Раснер (жыд), Грэбэ (немец), Рудніцкая (украінка), Струшыньскі (украінец), Унслед (жыд) і г. д. Паўнамоцнікам сьпіску зьяўляецца жыд Грынбаум. Гэткім чынам пан Ярэміч усё такі уціснуўся на трэцяе мейсца сьпіску хаця і адзін з беларусаў.

ЛІТВІНЫ АФІЦЫЯЛЬНА НЯ БУДУЦЬ ГАЛАСАВАЦЬ.

Літвіны ня прыймалі ўдзелу ў нарадах блёку нац. меншасьцяў у Варшаве пры разьдзеле мандатаў. Гэта быццам наступіла ў выніку дэцызіі Вальдэмараса. Нядаўна выяжджаў прадстаўнік літоўскага выбарнага камітэту да Коўны і Вальдэмарас быццам выразіў погляд, што літоўскі камітэт у Вільві ня мае права выступаць у выбарнай акцыі ад імя ўсіх літвінаў з блёкам нац. меншасьцяў, ці нават асобна, бо гэтым самым яны прызналі бы сябе нацыянальнаю меншасьцю, што пярэчыць пазыцыі літоўскага ураду ў гэтым пытаньні. У зьвязку з гэтым належыць чакаць, што літвіны афіцыяльна ня будуць прыймаць удзелу ў выбарах і разаб'юцца на некалькі групаў: адна праўдападобна будзе галасаваць за блёк нац. меншасьцяў, частка літвіноў у Сьвенцянскім павеце за блёк супрацоўніцтва з урадам ці за літоўскі сьпісак, які стаіць на грунце польскае дзяржаўнасьці. Гэткім чынам блёк нац. меншасьцяў ня можа рахаваць поўнасьцю на літвіноў, якія, падобна жыдам, разьбіліся на некалькі групаў.

ЗАБАРОНА КСЯНДЗАМ ЗАЙМАЦЦА ПАЛІТЫКАЮ.

Арцыбіскуп Холмскай парахвіі забараніў каталіцкаму духавенству прыймаць удзел у прадвыбарчай акцыі і выстаўляць свае кандыдатуры да Сойму і Сэнату. Аналёгічны загад зрабіў віленскі арцыбіскуп Яблжыкоўскі. Гэты крок вышэйшай духоўнай улады можна толькі шчыра прывітаць, бо служэньне царкве не соўмесьціма з палітыкаю, не разьбіраючайся ў сродках для дасягненьня сваіх мэтаў.

ПОУНЫ ПРАВАЛ „ВЫЗВАЛЕНЬНЯ"

Усялякія спробы вызваленцаў на тэрэні Маладэчанскага павету церпяць поўны правал. Народныя масы зусім ня хочуць слухаць гэтых ашуканцаў.

БЫУШЫ СЭНАТАР УЛАСАУ НЕ ВЫСТАУЛЯЕ КАНДЫДАТУРЫ.

Віленское „Słowo" (N 19) зьмяшчае наступнае пісьмо быўшага сэнатара А. Уласава:

„У газэтах ад часу да часу трапляюцца весткі аб тым, быццам я твару нейкі выбарны сьпісак. Гэтым паведамляю, што ні я, ні гуртуючаяся каля нашых культуральна-асьвятовых інстытуцыяў беларуская інтэлігэнцыя ня мае замяру выступаць з уласным сьпіскам да Сойму і Сэнату, а я асабіста ня буду выстаўляць кандыдатуры ні на якім сьпіску.

Б. сэнатар А. Уласаў.

Апошнія навіны.

З ПОЛЬШЧЫ.

УНУТРАНАЯ ДЗЯРЖАУНАЯ ПАЗЫКА.

Рада міністраў на паседжаньні 21 студзеня ўхваліла праэкт дэкрэту Прэзыдэнта Рэспублікі, упаважняючага міністра скарбу выпусьціць 4% унутраную прэм'ёвую будаўляную пазыку у разьмеры 50 мільёнаў у аблігацыях па 100 зл. на імя пакажчыка. Пазыка гарантуецца усею рухомаю і нярухомаю маемасьцю Дзяржавы. Выплачвацца будзе розыгрышам аблігацыяў ў працягу 10 гадоў. Розыгрыш прэм'яў будзе адбывацца два разы ў гаду — 1 красавіка і 1 кастрычніка.

Раяшнік.

(Аб „ходаньні“ „Спадара“ — „Сельсаюза“ № 2 — павадыра і аб іншым жыцьці, што да Сойму стаіць „напуці“)

——..——

Вось „Спадар“ хоць і лоўкі, хоць і мае няведама скуль залатоўкі, хоць кожнаму выдае ён мандат.

— у Сойм, дый ў Сэнат,—

аднак на ягоныя „ўзяткі“ ня надта хто ўжо „падкі“.

бо грошы бяруць, а працу для іншых вядуць...

А газэту „Народ“, дык шлюць усё ў зварот...

Але гатоў ён і ня піць і ня есьці, абы толькі ў Сойм-бы пралезьці...

——..——

А вось вам з жыдамі хаўрус, што з цэлага сьпіску аж... адзін беларус,

дый і той наш знаёмы — Ярома, а рэшта—то Янкель, то Шлёма, то з іншай „mniejszości“, як казаў той: ім мяса—нам косьці...

Вось дык Ярамок?! Але набудзе яшчэ ён дамок?!

Але-ж мой жа ты братка?! Ці-ж гэная гэта „шаснастка“?!

Што ў 22 годзе з Народам ў згодзе паслоў вібірала?!...

Ці ў сьпісках тады беларусоў „brakowało“?!

Ці-ж хто з-за мандата тады „калашмаціў“ брат брата?!

Бо тады адчуваўся адзіны і моцны ўсім „тон“, а кіраваў усім вядомы Антон...

А ня вы, дзеячы?!

Сядзець бы вам на „пячы“, дый пяткі „часаць“, а не хаўрусы складаць, бо нікога няма ўжо за вамі, а ў Сойм калі пройдзеце, дык не беларусоў галасамі..

——..——

А вось вам Шулейка, як той „прайдзісьвет“, адозву выпусьціў у сьвет, дый старшынёю „Прасьветы“ сябе „вялічае“ і з намі быццам „разрыў“ аглашае...

Ай ты Шулейка з „маральлю“?! Ці ж не цябе мы канальлю за нязгоднае з „чэсьцю“ жыцьцё выкінулі вон як сьмяцьцё — да нічога ня годнае і „Прасьвеце“ нашае шкоднае?...

Ну і сямейка?! — Міткевіч, Плаўсюк і Шулейка?!...

——..——

А „Маланка“ сказаць ўжо ня ў грэх — карыкатурамі мае пасьпех...

І злева і зправа хай будзе ей „брава“!

——..——

А некаторыя вось цёткі пакрыўдзіліся на слова „дэвоткі“...

Дык выбачайце вы нас, грамадзянкі, бо гэтыя быццам „абідныя“ „wzmianki“ датыкаліся ня ўсіх і не нашых жанчын і крыўдзіцца няма тут прычын...

А калі трэба — дык „вот“: свае словы бяру ўзварот....

Шэйнв-Катарынка.

ПОЛЬСКА-САВЕЦКІЯ ГАНДЛЕВЫЯ ПЕРАГАВОРЫ.

26 студзеня выехалі да Маскны дырэктар гандлёвага дэпартамэнту міністэрства гандлю і прамысловасьці Сакалоўскі і начальнік усходняга аддзелу мін. заграя. справаў Галуўко. Выязд гэтай дэлегацыі находзіцца ў зьвязку з савецкаю прапазыкаю распачаць гандлёвыя перагаворы. Пасьля палепшаньня польска-нямецкіх адносінаў з аднаго боку і паражэньня савецкай дыплёмацыі у Лёндане, Парыжу і Пэкіне з другога, саветы хочуць спрабаваць дасягнуць пасьпех на тэрэні унармаваньня сваіх адносінаў з суседзямі. Прыходзяць весткі, што Саветы рыхтуюцца ўнармаваць свае адносіны і з Румыніяй.

СЭНСАЦЫЙНЫ АРЫШТ.

24 студзеня ўвечары быў арыштаваны ў гмаху Рады Міністраў быўшы дырэктар дэпартамэнту Міністэрства скарбу за часу мін. Міхальскага і галоўны дырэктар будоўлянага банку Вышатыцкі. Арышт наступіў пасьля дапросу судзебным сьледавацелям. Пасьля арышту Вытатыцкі быў адасланы да турмы.

БІРЖЫШКА ў ПОЛЬШЧЫ.

Праз Рыгу праехаў да Варшавы прадстаўнік літоўскіх журналістаў пры Ковенскім Унівэрсытэце Біржышка, які ў 1922 г. быў выселяны польскімі ўладамі з Вільні.

Распаусюджывайце сваю газту.

З ЗАГРАНІЦЫ.

Прамова Чэмбэрлена.

Англійскі міністар заграгічных справаў сказаў у Бірмінгаме прамову, пасьвячоную вонкавай палітыцы. Ен адцяніў заслугі Макданальда ў вобласьці ўпарадачаньня адносінаў з Нямеччынаю і правядзеньні пляна Давуса. З мамэнту прыняцьця ім кіраваньня вонкаваю палітыкаю Англіі наступілі значныя перамены. Палепшалі адносіны з Нямеччынаю, якая ўступіла ў Лігу Народаў. Цяпер Францыя, Нямеччына, Італія і Англія працуюць разам для ўстанаўленьня ўсюды міру. Скіраваўшы свой узрок назад, сказаў Чэмбэрлен, я бачу, што за апошнія тры гады, гады цяжкай адказнасьці, мір у Эўропе ўзмацніўся. Аб Кітаі сказаў: захопленьне брытанскіх концэсыяў было дзействам, зробленым не ў безпасрэдніх інтарэсах Кітая, але ў інтарэсах сьвятовай рэвалюцыі. Гэты захоп быў выклікани працаю савецкіх агэнтаў. Ня гледзячы на гэтую правакацыю, мы адмовіліся разглядаць гэтую пагрозу, як ваеннае дзейства. Мы прадаўжаем трымацца палітыкі талеранцыі і згоды. Мы заўсёды гатовы пачаць з кітайскім народам перагаворы. Сытуацыя ў Кітаі некалькі палепшылася. Трудны пэрыёд кітайскай рэвалюцыі, калі яна знаходзілася пад уплываў бальшавікоў, мінаваў.

РАЗГРОМ САВЕЦКАЙ ВЫСТАУКІ у БЭЛЬГІІ.

Бэльгійская газэта „XX век“, расказаўшы сваім чытачом аб разгроме студэнтамі бальшавіцкай выстаўкі ў Бруселю, піша: „многія думалі, што бальшавікі могуць займацца наглаю прапагандаю іх ілжы ў самым сэрцы нашага краю, карыстаючыся папусьціцельствам нашае адміністрацыі. Мы першыя выказалі жаль аб тым, што маскоўскія падпалячы мелі магчымасьць рабіць у нас гэткую ганебную выстаўку, паказваючы свае „фальшыўкі“ замест запраўдных дасягненьняў цывілізацыі. Выбранікі моладзі гэта добра зразумелі. І мы іх шчыра вітаем. Цывілізацыя адказала варварскай выстаўцы тым, чаго гэта выстаўка заслугуе запраўды. Газ. „Свабодная Бэльгія“ піша: „выстаўка ў вачох папаўшых на яе прадстаўляла ілжывую прапаганду, ня меўшую іншй мэты, як прадставіць Савецкую Расею зямным раем. Гэты разгром выстаўкі быў карацельнай экспэдыцыяю, выкліканӑй савецкаю подласьцю і скіраваная да спыненьня агітацыі на карысьць дзікаром“. У гэтым духу піша і ўся рэшта прэсы. Нарэшце хоць адна дзяржава рашылася на гэроічны учынак, даўшы аплявуху зарваўшымся маскоўскім катам.

ГЭН. ГРЭНЭР ЗАМЕСТ ГЭСЛЕРА.

Прэзыдэнт Гіндэнбург звольніў на прапазыку канцлера міністра рэйхсвэры гэн. Гэслера згодна яго уласнай просьбе і вызначыў на яго места гэн. Грэнэра, зрабіўшага ваенную кар'еру ў канцы вайны. Нямецкая прэса прыняла гэтае назначэньне прыхільна.

ЛІТОУСКАЯ ДЭЛЕГАЦЫЯ ДА БЭРЛІНУ.

24 студзеня Вальдэмарас выехаў да Бэрліна разам з міністрам скарбу Шубэлісам і міністрам ральніцтва Алексы.

НЯУДАЛЫ КАМУНІСТЫЧНЫ ЗАМАХ НА ЛІТВЕ.

Палітычная паліцыя выкрыла вялікую камуністычную арганізацыю, якой „ячэйкі“ былі раскіданы па усей Літве. Арганізацыя мела безпасрэдні контакт з Масквою і рыхтавала дзяржаўны пераварот пры дапамозе некатарых гарнізонаў. Ваенны міністар Вальдэмарас, і начальнік гэнэральнага штабу былі асуджаны на сьмерць у адказ за Таўрогэнскія падзеі. Выканаўчы камітэт складаўся з 12 выдатных сябраў Маскоўскага Г.П.У., якія мелі пры сабе вялікія сумы грошаў і фальшывыя пашпарты. Арыштавана 23 асобы.

ДЫПЛЕМАТА ШПІЕН.

Гішпанскія ўлады арыштавалі савецкага „дыплёмату“ нейкага д-ра Дэльгада, які займаўся антыдзяржаўнаю прапагандаю. Маскоўскі урад выступіў з пратэстам. Дык вось чым займаюцца савецкія „дыплёматы“.

10 ТРАНСПАРТ ВАЕННЫХ МАТЭР'ЯЛАУ.

У С. Готардзе нядаўна быў затрыманы транспарт ваеннага матэр'ялу, укрытым спосабам правазіўшыйся да Вэнгрыі. Паводле вестак з Белграду румынскі пасол сьцьвердзіў, што гэта ужо дзесяты транспарт па чарзе, які быў высланы да Вэнгрыі пасьля заключэньня міра. Пры гэтым адцяніў, што Вэнгрыя можа цяпер узброіць 10 дывізіяў

У ЧЫРВОНЫМ ПЕКЛЕ.

200 МІЛЬЕНАУ НА ПАДТРЫМАНЬНЕ ДЫКТАТУРЫ СТАЛІНА.

Троцкі перад сваею ссылкаю „на столь оддалённыя места“ (Верны у Туркестане на граніцы Кітая) зрабіў сэнсацыйную рэваляцыю, што цяперашні маскоўскі дыктатар Сталін карыстаўся для пакрыцьця уласных выдаткаў, зьвязаных з падтрыманьнем дыктатуры, грашмі з тайнага фонду. Фонд гэты быў арганізаваны яшчэ Леніным і вызначаўся на самыя цяжкі хвілі для дыктатуры. Сталін выдаў з гэтага фонду на ўласныя патрэбы 200 міл. зал. руб. (нічога сабе кавалачак). Троцкі мусіць незадаваляны, што гэта сума не папала ў яго лапы.

АПАЗЫЦЫЙНАЯ АГІТАЦЫЯ ў РАСЕІ.

Ня гледзячы на строгія меры і рэпрэсыі проці апазыцыянэраў апазыцыйная агітацыя ў Расеі ня спыняецца. Асабліва Масква ёсьць засыпана праклямацыямі, падбухторываючымі проці Сталіна і яго банды. У аднэй з гэтых лятучак зьмешчана размова Троцкага з Радэкам, у якой Троцкі абвінавачвае кіраўнікоў палітбюро у тым, што гэта людзі, нямаючыя нічога супольнага з чыстым камунізмам. Троцкі з жальбою заяўляе, што нічога не засталося ад таго настрою, які прывёў масы да кастрычнікавай рэвалюцыі і далып пагражае, что катастрофа для Сталінаўскай клікі няўнікнёна... Вось тут і сам чорт не разьбярэ, хто з іх запраўдны камуніста. Ці ж гэта справядліва: пры камуністычнай уладзе, самыя верныя і чыстыя камуністы, барацьбіты за камуністычны рай сасланы ў ссылку, а „здраднікі“ камунізму пануюць у камуністычным раю?

ВЫЯЗД ТРОЦКАГА ў ССЫЛКУ.

У нядзелю вечарам 15 студзеня Троцкі пакінуў Маскву, адправіўшыся па загаду Ц. Вык. К-ту Ташкентскім цягнікам да места Вернага на граніцы Кітая. Калі Троцкі прыбыў на станцыю, сабраўшаяся таўпа прывітала яго сьпевам „Інтэрнацыяналу“. Троцкі, акружаны паліцыяй, бледны, але спакойны сеў у вагон і ня выходзіў з яго да адходу цягніка. У гэты-ж дзень выехалі з Масквы Радэк, Смілга і іншыя апазыцыянэры.

СЯЛЯНЕ МАРДУЮЦЬ КАМУНІСТАУ.

Каля возяра Ладога апярыруе ўжо доўгі час добра з'арганізаваная паўстанчаская сялянская банда. Яна займаецца мардаваньня камуністаў. Нядаўна ў в. Носоўскай вымардавала 65 камуністаў. Пасьля доўгай барацьбы бальшавікі зьліквідавалі гэтую банду і на лаве абвінавачаньня сядзе 26 партызанаў.

ЗАМАХ НА КАМІСАРА РАДАВАИ УКРАІНЫ.

На камісара Радавай Украіны Скрыпніка, ворага украінскіх нацыяналістаў, быў зроблены замах. Скрыпнік ехаў на дрызіне, якая каля ст. Паўлаград пацярпела катастрофу. Як сьледзтва устанавіла незадоўга перад праездам дрэзіны былі разьвінчаны рэльсы і дрэзіна скацілася з насыпі. Жалезнадарожнік, кіраваўшы дрэзінаю быў забіты на мейсцы, а камісар Скрыпнік ранены. Г.П.У. вядзе сьледзтва.

ПОМСТА ЧЫРВОНААРМЕЙЦАУ.

Некалькі чырвонаармейцаў зарэзалі камандзіра роты войск Г. П. У. камуніста Хлебнікава. Хлебнікаў ужо даўно атрымліваў пісьмы з пагрозамі ад чырвонаармейцаў за сваю жорсткасьць. Па падазрэньню у мордзе арыштавана некалькі чырвонаармейцаў і камсамольцаў.

АРЫШТ 500 „СПЕКУЛЯНТАУ“ ХЛЕБАМ.

Нямецкія газэты паведамляюць з Масквы, што за апошнія два тыдні арыштавана 500 „спэкулянтаў“ хлебам. Апошнія арышты былі зроблены на Урале, дзе арыштавана каля 100 чалавек.

АРЫШТЫ ДЫПЛЕМАТЫЧНЫХ КУР'ЕРАУ.

З Масквы паведамляюць, што там арыштавана некалькі дыплёматычных кур'ераў камісар'яту заграгічных справаў, абвінавачаных у тым, што яны перавазілі разам з дыплёматычнай карэспандэнцыяй пісьмы апазыцыянэраў да іх загранічных таварышаў.

ЦЫВІЛІЗАВАНЫЯ ВАРВАРЫ.

Палітычныя савецкія ўлады ў Тверы зрабілі загад пракантраляваць мястовую бібліятэку і зьнішчыць усіх „буржуазных“ аўтараў. У выніку гэтага кантролю было спаляна 5,000 твораў Шэкспіра, Пушкіна Шчэдрына і іншых выдатных пісьменьнікаў. Кнігі гэтыя паліліся ў працягу 2 дзён. У бібліятэцы засталося толькі 500 тамоў.

ЖЫДОУСКАЯ РЭСПУБЛІКА ў СЫБІРЫ.

„Савецкая Беларусь“ ад 26 студзеня падае, што на II зьезьдзе жыдоўскіх рольнікаў у Менску Савецкі Урад унёс на зацьверджаньне вялікі плян заснаваньня на Д. Усходзе жыдоўскае рэспублікі. Для гэтае мэты у раёне Бійска на поўдзень ад р. Амур будзе адведзены вялікі абшар вельмі добрай зямлі. Але, як відаць з правазданьня аб зьездзе, жыды ня вельмі задаволяны гэтым плянам. Ну уласьне... Ляпей атрымліваць лепшую зямлю на Украіне і у Крыму, чым дзесь у Сыбіры.

Дэкляацыя.

Да Беларускай Нац. Рады і Партыі і Выбарнага Народнага Камітэту. ў Вільні.

Я, ніжэйпадпісаны сябра галоўнага Ураду Радыкальнай Партыі Заходняе Беларусі, азнаёміўшыся з праграмай Бел. Нац. Рады, Партыі і Выбарнага Народнага Камітэту, гэтым даводжу да агульнага ведама, што далучаюся да гэтых арганізацыяў, выхаджу з Радыкальнай партыі і заклікаю ўсіх чэсных грамадзян і сяброў гэтай арганізацыі далучыцца да Бел. Нац. Рады, Партыі і да Агульна Народнага Беларускага Выбарнага Камітэту.

Быўшы сябра галоўнага ўраду Радыкальнай Сялянскай Партыі Заходняй Беларусі.

Антон Русецкі.

В. Генеўцы, Куцэвіцкай гм. Ашмянскага пав. 19 студзеня 1928 г.

ЖАРА У КРЫМУ, МАРОЗЫ НА КАУКАЗЕ.

У мінуўшым тыдні ў Крыму стаяў упал, дасягаючы 30%, а на Каўказе мароз і сьнежныя заносы. Каля Вернага замёрзла у гарах 70 чалавек.

Тутэйшая хроніка.

КІРМАШ „КАЗЮКА“ ПЕРАНОСІЦЦА НА 8 САКАВІКА. У зьвязку з тым, што выбары да Сойму прыпадаюць на 4 сакавіка, які сходзіцца з вялікім кірмашом у Вільні на Лукішскім рынку, гэтак званым кірмашом „Казюка“. Віленскі Ваявода аддаў загад аб пераносе гэтага кірмашу на дзень 8 сакавіка. Аднагасова п. Ваявода зьвярнуўся да каталіцкага і праваслаўнага духавенства з просьбаю, каб як магчыма найшырэй абвясьцілі аб гэтым сялянству. Тых, хто, няведаючы аб гэтым загадзе, прыедзе на кірмаш 4 сакавіка, паліцыя ня будзе пушчаць у Вільню, паведамляючы аб пераносе кірмашу на 8 сакавіка.

— **АРЫШТ ШАПЕЛЯ** „Dz. Wil.“ (N 20) падае, што 25 студзеня раніцою па загаду пракурорскіх уладаў быў арыштаваны быўшы пасол А. Шапель, адзін з галоўнейшых дзеячоў зьліквідаванаў камуністычнай Незалежнай Партыі Хлопскай. Арышт гэты наступіў у выніку закончанага сьледзтва пракурорскіх уладаў у справе камуністычнай дзеяльнасьці Н. П. Х. Сьвенцянскі камітэт Н. П. Х., галоўным кіраўніком якой быў Шапель, знаходзіўся ў цеснай сувязі з Менскімі камуністамі, куды высылаў нават сваіх дэлегатаў на агітатарскія курсы. Шапель пасьля арышту ў Сьвенцянах перавезяны да Вільні на Лукішкі.

— **АРЫШТ Б. ПАСЛА РАГУЛІ.** Як падае „Сель. Ніва“, 19 гэтага месяца а 9 гадзіне раніцай ў памешканьні Акружнога Выбарнага К-ту ў Наваградку па распараджэньню пракурора Наваградзкага Акружнога Суду быў заарыштаваны былы пасол Рагуля. Пасьля дапросаў у сьледвацеля, Рагуля быў адпраўлены ў камісарыят павятовай паліцыі. Па зложэньні залогу 500 зл. сьледавацель звольніў б. пасла Рагулю, адабраўшы падпіску аб нявыязьдзе з Наваградзкага судовага вокругу. Рагулю абвінавачваюць па 129 арт. за прамову падчас мітынгу ў Наваградку 22 траўня 1927 г. Яму пагражае турма ад 1 да 4 г...

Кончылася, паны быўшыя паслы, ваша нятыкальнасьць. Умелі прамаўляць і пхаць у турмы нявінныя ахвяры, ўмейце і адказ трымаць!...

— **ТЛУМАЧЫЦЦА...** У „Крыніцы“ (N 4) і „Сел. Ніве“ (N 6) былі зьмешчаны пісьмы ў рэдакцыю П. Булгака, ў якіх апошні дае адказ на заўвагу ў нашай газэце (№ 40) „Мар'янэтачная афэра Пётры Булгака“. Прызнаўшы, што 12 траўня 1927 г., была падпісана ўмова з урадам „Бел. Хаткі“ на 400 зл. (70 зл. пры падпісаньні ўмовы і рэшты ў 5 срокаў), П. Булгак піша, што ён, „пачаўшы выпаўняць прынятую на сябе работу і патраціўшы на яе больш 2,000 зл. (!!!) уласных грошаў, ніяк ня мог дабіцца, каб „Бел. Хатка“ выпаўніла прынятае на сябе абавязаньне па выплаце мне азначаных умовою ратаў“...

Па першае п. Булгак дапусьціў ілжу, не ўспомніўшы аб тых 210 зл., якія ён атрымаў у лік гэтай работы і на якія урад „Бел. Хаткі“ мае пакварованьне... А затым п. Булгак хоча ўцерці некаму акуляры, ляпнуўшы, як у лужу, што ён „патраціў на гэтую работу больш, як 2,000 зл., уласных грошаў“... Уся работа каштавала 400 зл., а п. Булгак патраціў больш 2.000 уласных грошаў!!!

Хоць не сьмяшыў-бы публіку, пане Булгак. Гэта-ж вам не мар'янэтачны тэатр!!! І гэта называецца „вытлумачыўся“...

P. S. Падрабязныя тлумачэньні і ўжо зусім іншыя п. Булгаку, мар'янэтачнаму дырэктару, прыйдзецца даць у судзе па абвінавачаньню яго ў „oszustwie“.

ЖЫЦЬЦЕ ПРОВІНЦЫІ.

Праца „Прасьветы“

(*Спэктакль у м. Дзятлаве*)

Аматорская трупа пры Дзятлаўскім аддзеле „Прасьветы“ 15 студзеня г. г. наладзіла сваімі ўласнымі сіламі спэктакль у м. Дзятлаве, Навагрудзкага пав. у памешканьні „Народнага Дому“. Былі пастаўлены і адыграны тры аднаактовыя камэдыі „Боты, „Лехтары і лекі“ і „Зьбянтэжаны Саўка“ пад кіраўніцтвам вопытнага артысты-рэжысэра, Александра Лазоўскага. П'есы былі выпаўнены артыстамі вельмі добра. „Зьбянтэжаны Саўка“, ў ролі Саўкі — Мікалай Белуга, ў ролі Магрэты—Надзя Чырвоная.

Гэта быў вечар сьмеху і гумару. Пасьля кожнага акту былі няскончальныя воплескі, публіка засталася вельмі задаволеная спэктаклем і ігрой артыстаў. Шмат асобаў прыходзіла за кулісы яшчэ раз падзякаваць кіраўніка і артыстаў. Пасьля адбыліся скокі пад ігру духавога і струннага аркестру.

Прысутны.

Беларускі спэктакль.

(*Беніца, Маладэчанскага пав.*)

Калі я дачуўся, што нашыя культурныя працаўнікі ладзяць спэктакль у салі гміннай ў Беніцы, я цьвёрда пастанавіў пабываць на ім, як на першым спэктаклю у Бэніцы. (Праўда былі наладжаны спэктаклі на вёсках пад кіраўніцтвам Асіповіча, але не даводзілася на іх быць). І вось 7. 1-28 г. пад вечар я сабраўся з сваімі сябрамі. Прыбываем у салю, а там зараз надходзіць пастарунковы і разганяе. Хаця мы разыйшліся, але не страцілі надзеі, бо калі былі разьвешаны афішы, то значыць мусіла быць. Зараз прыбылі артысты Лебедзеўскай вандроўнай трупы на чале з гр. Т. Сьвірыдам і артысты Драматычнай Сэкцыі Румянцаўскага Аддзелу на чале з гр. Асіповічам. Праз нейкі час адкрылася заслона і на сцэне ўбачылі дэкарацыі гэта ігралі „Заручыны Паўлінкі“: — Аляхновіча.

Ах, як гэта ўсё была міла зроблена! Як па мастацкі разыгрывалі ролі артысты. Пасыпаўся гром воплескаў. Праз хвіліну ўбачылі і жарт Родзевіча „Забянтэжанага Саўку“. Тут ужо ўсе прысутныя былі агарнуты сьмехам. І закончылася праграма спэктаклю фарсам „У доктара“. Усе клаліся ад сьмеху. І цяпер амаль у кожнай вёсцы ўспамінаюць і заліваюцца ад сьмеху. Далейшая праграма—скокі пад струнны аркестр сяброў мяйсцовага аддзелу. Буфэт. Пошта. Усе прысутныя разыйшліся каля гадзіны 5-й з надзеяй, што гэтакія спэктаклі будуць часьцей ладзіцца. І вось ізноў, як чуў, ладзіцца спэктакль пад кіраўніцтвам гр. П. Асіповіча. Ставяць „Птушку Шчасьця“.

Чэсьць Вам і слава, дарагія сяўбіты Культуры! Найшчырэйшае дзякуй ад усіх прысутных для тых асоб, якія паложылі найбольш працы, як гр. гр. Сьвірыд і П. Асіповіч!

Госьць

Як яны „пераконвываюць“.

За якую беларускую газэту толькі ня возьмешся, дык у кожнай толькі і бачыш, што сябе хвалюць, а ўсіх іншых лаюць. Як тутака разабрацца простаму селяніну ў тым, хто піша праўду і зьяўляецца запраўдным і шчырым барацьбітом за Беларускі Народ, а хто толькі стараецца ашукаць яго і зьбіць з правідловага шляху?

Тут, усе мяне ведаюць і ўсе пытаюцца, за які N мы павінны галасаваць? Каб без памылкі сказаць сваім суседзям праўду, трэба добра ведаць аблічча ўсіх партыяў.

Гэтая Грамада са сваімі „Думкамі Працы“ працуе толькі дзеля таго, каб больш напхаць у турмы несьвядомых беларусоў, аб тым я ўжо пісаў у N 1 (109) „Бел. Слова“. Дзякуй Богу „Праца“ ўжо ад мяне адчапілася пасьля таго, як напісаў на пошту ў Юрацішкі, каб мне „Думкі“ сваей ня выдавалі.

Паны Ярэміч і Рагуля вядомыя ўсім, агітаваўшым у 1922 г., а каму невядомы, дык скажу, што яны між іншымі агітатарамі хадзілі ды толькі хваліліся, што яны надта добра ўмеюць прамаўляць і што яны за свае прамовы абавязкова пападуць у Сойм. Аднак-жа хай гэтага ня чакаюць, бо я размаўляў з гаспадарамі Суботніцкай гміны, якія чулі 3 месяцы таму назад у Суботніках прамову Ярэміча і якія цяпер ня хочуць яго слухаць балей.

Нямаючы ніякай веры ні да воднай з гэтых партыяў, я лічыў за самую лепшую *Нацыянальную Раду і Партыю.* Аднак-жа мяне надта цікавіла, што гэта за партыя, якая выдае „Народ“, дый просячы ахвяраў на сваю часопісь, усім высылаець дарма аж па 3 экз. газэты. Ажно гляджу, да мяне прыперлі дэпэшу з подпісам Станкевіча, які просіць прыехаць да яго за яго кошт. Я падумаў: ну што-ж пагляджу, што гэта там за шышка такая... Паехаў, а там п. Станкевіч, не знаёмы і пры першым спатканьні прэ мяне ў Сэнат, кажучы, што ў яго няма адпаведных пажылых людзей, якія-б маглі прайсьці ў Сэнат, дык мы маем надзею на Вас. Ну добра, забачу, што будзе далей. У чужой хаце трэба слухаць гаспадара, каб яго ня скрыўдзіць. Папрасіў напісаць карэспандэнцыю і я яму пад хмяльком напісаў аж цэлых тры. Няведаю толькі, чаму ён зьмясьціў толькі адну.

Прыехаўшы да хаты, мяне надта мучыла суменьне, што я, быўшы пад хмяльком, пісаў глупствы на свайго паважанага павадыра п. П а ў л ю к е в і ч а. Я пачаў думаць і мне здалося, што ў „Народзе“ ёсьць штосьці ня шчырае, ёсьць якаясь мана. Станкевіч пытаўся ці я пайду куды, ці не? Я яму адказаў, што зайду да рэдакцыі „Саха“, хачу выпісаць гэтую газэту, але п. Станкевіч папярэдзіў мяне. Будзьце, кажа, асьцярожны, бо там ёсьць і дэфэнзыва, ёсьць, кажа, і камуністыя. Толькі нікаму і нічога не гаварыце, што былі ў нас. Пры гэтым усунуў мне 100 зл. ды сказаў, што гэта толькі на 2 тыдні, а 1 лютага ізноў атрымаеце. Акрамя таго 23 зл. 20 гр., што я заплаціў за цягнік. Цяпер я ніяк не магу зразумець, скуль у іх столькі грошаў, калі аднаму мне ўсунулі столькі, а колькі-ж ідзе на ўсіх! А ў газэце просяць ахвяраў і дастаюць на 1—2 зл.

Цяпёрака, як я пераканаўся, дык п. Станкевіч так-жа, як і Грамада, жадае толькі ўпхнуць каго за краты і заместа Сэнату я мог папасьці на,.. Лукішкі...

Я паслаў Сканкевічу карэспандэнцыю дзеля таго, каб змусіць яго быць са мною адкрытым. Але я пераканаўся, што „Народ“ ня ідзе за Народ, а толькі за мандатамі. Толькі вельмі цікава, скуль у іх грошы? Бо Станкевіч казаў, што яны грошы маюць, не пашкадуюць — атрымалі !!!

Дык паверыўшы, даражэнькія чытачы, ў шчырасьць майго прызнаньня, усе як адзін галасуйце за Цэнтральны Агульна-Беларускі Народны Выбарны Камітэт, які запраўды жадае толькі дабра для Беларускага Народу, ў той час, як астальныя толькі жадаюць прыгожымі словамі купіць сабе мандацікі. Я пераканаўся, што калі-б быўшым паслом была вызначана пэнсыя ў якіх 200 злот. у месяц і бязплатны праезд у 3 клясе, дык усе гэтыя дабрадзеі беларускага народу адразу разьляцеліся-бы, як дым з коміну у паветры і ніводнага дабрадзея ня было-бы.

Кастусь Сьветавастокаў.

21-1 1928 г.
ф. Яросмішкі, Юрацiскай гм.

Як у нас дамагаліся роднай школы.

(*Вёска Морачы, Заостравецкае гміны*).

Колькі яшчэ цемнаты і несьвядомасьці ў нашых сялян і колькі яшчэ патрэба доўгае, ахвярнае працы палажыць культурнаасьвятовым установам, каб перамагчы пананаваньне гэтай цемры, пакажа наступны факт. Сьледам за другімі вёскамі і нашы, Морачане, надумаліся падаць Школьнаму Інспэктару дэклярацыі абператварэньні існуючай польскай школы на беларускую. Тутэйшы, толькі што паўсталы Гурток Т-ва „Прасьветы“ з усею інтэнсыўнасьцю пашоў на помач бацьком. Праўда, ўсе, як адзін, пастанавілі скласьці Школьнаму Інспэктару дэклярацыі і падпісалі іх на 70 дзяцей школьнага веку. Але, як прышлося зьезьдзіць у гміну, каб сьцьвердзіць свае подпісы, найшлося толькі 9 бацькоў, якія не пашкадавалі дня і былі ў войта. Рэшта—таму трэба было ехаць па сена, гэтаму ніяк нельга, бо дроў ня было, а дзядзька Вавіла — дык проста не паехаў, бо як-жа з цёплаю печкаю растанецца? Што яму школа? Да гміны? Але-ж на печы лягпей!

Вось яна, цёмната, нядбальства! Ці знаеце, што вы зрабілі праз сваю цемнату; сваё гультайства? Вы аставілі далей калечыць душы сваіх дзяцей, адказнасьць за гэта падае на вас. Праўда, вы хацелі, каб ператварыць польскую школу на беларускую і падпісалі дэкляроцыі, але пераехаць да гміны, дык вам трудна здалося. Вы хацелі-б, каб вінаград сам рваўся ды ў рот клаўся? Ганьба вам, Морачане! Праклёны дзяцей вашых ужо нясуцца да Неба!

Праўда, вінавата тут ваша цемната, несьвядомасьць. Дык будзіцеся за сну, асьведамляйцеся, чытайце беларускія газэты. Гурток Морацкі Т-ва „Прасьветы“ вам дапаможа. Дык усе да гэтага Гуртка! Усе да „Прасьветы“!

Чэсьць і падзяка ад „Прасьветы“, Мікалаю Абабурко, Леону Лапаце, Мацею Краўчуку, Рыгору і Янку Грушы, што першыя паехалі да гміны. Ня ваша віна, што другія занедбальствам, сплямілі сваеімёны. Чэсьць Вам!

1 студзеня 1928 г.

Морачанік.

Ганебны учынак.

(*в. Сычавічы Маладэчанскага пав.*)

У дзень 26 сьнежня 1927 г. на другі дзень сьвята Каляд, адбылася пакража хлапцамі вёскі Сычавічы М. С. М. Р., З. Р., і В. С. у хлапцоў вёскі Красоўшчыны. Здарылася гэта так.

Хлапцы вёскі Красоўшчыны, ведаючы калядныя песьні, хадзілі па чужых вёсках з абразом і сьпявалі, а за гэта ім сяляне давалі грошы і збожжа, якое хурман вазіў на сваім возе. Ходзячы па чужых вёсках і не спатыкаючы нічога благога, хлапцы зайшлі й ў вёску Сычавічы, але ня так хлапцы вёскі Сычавіч прынялі сваіх гасьцей, якія па сабе пакідалі памятку старым і малым. Хлапцы вёскі Сычавіч, прыпільнаваўшы, як хлапцы вёскі Красоўшчыны сьпявалі пад вокнамі сялян, я ля воза быў адзін толькі хурман, акружылі хурмана, ўкралі ў яго адзін пуд і 10 фунтаў аўса, а самі, настрашыўшы яго, ўцяклі. Тады хлапцы вёскі Красоўшчыны, бачучы гэткае нахальства Сычэўскіх хлапцоў, пакінулі гэту вёску і паехалі ў другую. Толькі праз некалькі гадзін Сычоўскія хлапцы вышлі на вуліцу, ўжо прадаўшы авёс Івану Рудзю за дзьве (2) бутэлькі дзінатуры, і напіўшыся, хадзілі па вуліцы пьяныя і раскідалі гурбы сьнегу, шукаючы каменьні, каб біцца.

На заўтра, на трэці дзень Каляд хлапцы вёскі Красоўшчыны варочаліся дамоў праз вёску Сычавічы, каб пачуць, што аб пакражы і якраз ім удалося пазнаць тых пьяніц, якія пакралі авёс. Тады Красоўскія хлапцы, доўга не чакаючы, залажылі каня і прывязьлі паліцыю з мястэчка Радашкавіч, якая адабраўшы авёс і сьпісаўшы пратакол, скіравала справу ў суд.

Брыдка вам, хлопцы, і ганьба!

Сычавец.

Ну й кіраунікі!

(*Заостравечча Нясьвіскага пав.*)

Каля Заостравецкае гміны праходзіць граніца з С.С.Р.Р. Уздоўж гэтай граніцы цягнуцца яшчэ векавыя лясы і багністыя трушчобы. Дык яны цяпер сякуцца ў пень на поў кілямэтра ўздоўж граніцы. Работнікаў тут працуе шмат. З аднае в. Морачы выходзіць да працы туды больш як 200 чалавек у дзень. Работаю кіруе лясьніцтва Хамінка. Але як кіруе? Зьбяруць чалавек 300 ці больш у адну кучу, тут і валяць, і сякуць, і гальлё зьбіраюць. А калі каго-небудзь там заб'е дуб, альбо хвоя, ці-ж гэта дзіва? Што цяпер чалавек варты? Гэтак яно і выходзіць. Кожны дзень гальлё дуба альбо хвоі накрые колькі чалавек. Дзіва яшчэ, што неяк паўцекаюць. Пакуль дрэва не падае, барані Божа, ўцякаць: запішуць і зьляцела плата. Але вось у сьнежні 1926 г. дуб пачаў падаць на цэлую кучу людзей, ледзь паўцякалі. Ня мог уцячы Янка Абабурка з в. Морачы, якога і забіла. Другім разам хвоя здрузгатала ногі Мар'і Абабурко, з тае-ж вёскі. Людзі пачынаюць баяцца ісьці на работу. Што гэта? Ці трэба канешна, каб, дзе валяюць, былі тоўпы людзей? А можа П. Кіраўнік інакшай ня ўмее кіраваць працаю?

Р. Р.

1 студзеня 1928 г.

УСЯЧЫНА.

МЕШКАНЕВАЯ НЭНДЗА У ПАРЫЖУ.

Аказваецца, што ня толькі ў нас пытаньне аб памешканьнях зьяўляецца самым балючым. Нават у Парыжу, у гэтай „сталіцы сьвету“ істнуюць нялюдзкія варункі мешканёвага жыцьця, ня гледзячы на тое, што парыжскія мястовыя ўлады моцна падтрымліваюць будову новых дамоў. Паводле француская газ. „Котыдзьен“ у Парыжу з 4 міл. з чымсь жыхараў 186,000 жыве ў 4,920 дамах, прызнаных у гігіенічных адносінах зусім няпрыгоднымі для жыцьця. У 60,000 пакоях жыве па некалькі асобаў. Лічба асобаў, пражываючых у немагчымых варунках, дасягае 310,000, спрыяючых алькогалізму, сухотам і іншым хваробам. Газэта дабаўляе ў канцы, што гэткія варункі жыцьця істнуюць так-жа ў Ліёне, Марсэлі, Бордо, Лілі і шмат іншых францускіх местах.

ГОНОРАР АДВАКАТА.

У канцы сьнежня выяхаў з Лёндана да Індыі вядомы англійскі адвакат, пасол парлямэнту ад Лівэрпулю Сэр Лесьлі Скотт. Яго запрасілі некалькі індыйскіх князёў для нарады па рожным спрэчкам між імі і Англійскім урадам. Сэр Лесьлі Скотт выяхаў на тры месяцы. На гэтую паездку ён атрымаў 53,000 ф. штэрлінгаў адначасова гонарору і па 200 ф. сутачных.

Юрыдычныя парады.

Грам. А. Г-чу. Запытаньне. 1. Ці могуць забараніць апякуны дзяўчыны, а такжа жонка апісаўшага маемасьць ей выйсьці замуж і ўзяць сабе надомніка і наагул — якія абавязкі і правы апякуноў над дзіцяцей?

Адказ 1. Апякуны над малалетнімі да 17 году маюць амаль не такія-ж правы і абавязкі, як і бацькі. Яны павінны дбаць аб выхаваньні дзіцяці, аб яго ўтрыманьні і яго маемасьці. Затое і дзіця павінна ім падпарадкоўвацца. Згодна закону — выйсьці замуж, ці жаніцца непаўналетнія могуць толькі за згодай бацькоў або апякуноў. Гэткім чынам, калі вышая сястра ня мае яшчэ 17 гадоў то хоць мае права выйсьці замуж па канонічнаму (царкоўнаму) праву (можна выхадзіць замуж дзяўчыне, маючай 16 поўных гадоў), еднак-жа толькі са згоды апякуноў. Надомніка браць бяз волі апякуноў тым больш ня можа, бо да паўналецтва г. зн. 21 году, яна ня мае права самастойна распараджацца сваёй маемасьцяй.

Запытаньне. 2. Ці можна было-б па закону перавясьці на надомніка ўсю зямлю так, каб у разе сьмерці насьледніка — дзіцяці памершага ўласьніка гэтае зямлі, яна дасталася надомніку. Калі можна — як гэта зрабіць?

Адказ 2. Зрабіць гэтага нельга. Надомнік адно мае права атрымаць ад жонкі яе ўказную долю. Г. зн. жонка пасьля сьмерці мужа выдзяляе сабе (ў натуры, ці праз Суд) $^1/_7$ часьць зямлі і $^1/_4$ ч. рухомасьці і гэтую часьць, як асабістую ўласнасьць перадае свайму другому мужу. Больш ніякіх правоў надомнік на зямлю першага мужа сваей жонкі ня мае. Канешна ў выпадку, калі ў жонкі няма дзяцей ад першага мужа і ўзяўшы надомніка яна з ім будзе спакойна, без перарыву і спрэчак судовых уладаць зямлёй 1-га мужа больш 10 гадоў — яны абое набываюць права ўласнасьці на гэтую зямлю па даўнасьці. Што датычыць пытаньня 1-га дык адказ падрабязны высылаецца вам аддзельным пісьмом.

Грам. З. Календа. Адказ пасылаецца пісьмом.

Паштовая скрынка.

Ян Антонік — патрэбны матэр'ял для заложэньня гуртка „Прасьветы“ Вам высланы. Пішыце карэспандэнцыі.

Кастусь Лавыш, Ул. Гінько, У. Таўкач,

А. Кароўчык, Я. Воўк, Т. Доўгач, М. Мядзьведзь, В. Ракевіч, Г. Чак, В. Кірэй, газэта высылаецца.

А. Цупрык. — праграмы стралецкіх колак ня маем. Гэта Вы можаце атрымаць у кожным колку на мейсцы.

Адказны Редактар Т. Вернікоўскі. Друк. І. Баеўскага Вільня, Мастовая 9. Выдавец Беларуская Нацыянальная Рада.